УДК 904 (367): 293.21"07/09"

*ISSN 2223-1218*
*Матеріали і дослідження*
*з археології Прикарпаття і Волині.*
*2016. Вип. 20. С. 150–164*

# МАЛЫЯ ГАРАДЗІШЧЫ-СВЯЦІЛІШЧЫ СЛАВЯН

*Эдвард ЗАЙКОЎСКІ*

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1/2, 220072, г. Мінск, Беларусь, e-mail: edvard_mensk@tut.by*

Упершыню група малых круглых гарадзішчаў была выдзелена сярод помнікаў Смаленшчыны ў 1920-я гады А. Ляўданскім, які меркаваў, што яны маглі сужыць для абрадавых мэтаў. У пасляваенны час В. Сядоў датаваў іх VIII–Хстст. і абгрунтаваў культавае прызначэнне. Але паколькі некаторыя з гарадзішчаў-свяцілішчаў Смаленшчыны размешчаны ў паніжаных месцах, то абодва гэтыя даследчыкі лічылі такое размяшчэнне характэрнай рысай помнікаў дадзенага тыпу.

Аднак пазней малыя гарадзішчы-свяцілішчы былі выяўлены і даследаваліся ў Сярэднім Падністроўі і вярхоўях Прута на захадзе Украіны, дзе размяшчаліся на высокіх узгорках. Амаль усе яны былі абкружаны сінхроннымі ім селішчамі і з'ўляліся культавымі цэнтрамі вялікіх гнёздаў паселішчаў, а спынілі сваё існаванне ўжо пасля хрысціянізацыі.

У Беларусі эталонным помнікам такога тыпу з'яўляецца гарадзішча-свяцілішча Верхаўляны, якое ўзнікла ў X ст. Аднатыпнае з ім свяцілішча Малочкі на ўсходзе Польшчы. Акрамя таго, па асноўных прыкметах аналагічнымі малым круглым гарадзішчам-свяцілішчам трэба прызнаць шэраг іншых помнікаў на тэрыторыі Беларусі, Польскага Памор'я, былых землях палабскіх славян і нават у Латвіі (дзе могуць быць звязаны з пранікненнем асобных груп славян у іншаэтнічнае асяроддзе.

***Ключавыя словы:*** гарадзішчы, свяцілішчы, паселішчы, Верхаўляны, славяне.

Яшчэ ў першай палове 1920-х гадоў А. Ляўданскі, які ў той перыяд займаўся вывучэннем археалагічных помнікаў Смаленскай губерні, выдзеліў асобную групу круглых гарадзішчаў і вызначыў іх асноўныя характэрныя прыкметы. Ён адзначыў, што гэтыя гарадзішчы размешчаны ў нізінах паблізу рэчак на прыродных астраўках або штучна насыпаны на не вельмі балоцістым месцы паблізу балота ў канцы нізкага мыса. Гарадзішчы маюць круглую ці амаль круглую форму, і пляцоўкі вельмі невялікіх памераў — ад 19 да 28 м дыяметрам пры вышыні ад 1,4 да 3,2 м ад узроўню балота. Пляцоўка іх абкружана адным ці двума валамі, а ў некаторых з гэтых гарадзішчаў пляцоўка мае лейкападобную ўвагнутасць, глыбінёй ад 0,55 да 1,07 м. У чатырох з сямі гарадзішчаў адзін бок пляцоўкі прыўзняты, у той час як у астатніх яна роўная.

Валы ад пляцоўкі знаходзяцца то вельмі блізка (у 6 гарадзішчаў), утвараючы паміж сабой роў, то на некаторым аддаленні (на гарадзішчы Краснагор'е ад 10,6 да 19,2 м), і тады гэты прамежак мае выгляд як бы невялікага дворыка, на якім сляды ірва не прыкметныя (мал. 1). На пляцоўках двух гарадзішчаў (Краснагор'е, Кушляншчына) з таго боку, дзе яны прыўзнятыя, маецца каменная выбрукоўка з дробнага булыжніка, якая залягае на глыбіні ад 0,55 да 1,0 м. Выбрукоўка паводле дадзеных абследавання займае нязначную плошчу.

Складзена яна з невялікіх (велічынёй з кулак) камянёў, у выглядзе роўнага пласту таўшчынёй 0,22 м. Камяні нічым не змацаваныя і не маюць слядоў абпаленасці. Вышэй іх часам бачныя дробныя вугольчыкі і попел, перамяшаны з зямлёй. На ўсіх астатніх гарадзішчах на пляцоўках залягае нятоўсты (ад 0,15 да 0,25 м) пласт цёмна-шэрага колеру, які складаецца з дробных вугольчыкаў і попелу, перамяшаных з зямлёй. Кераміка, косці і рэчы на гарадзішчах адсутнічаюць.

© Зайкоўскі Э., 2016

Уваход на пляцоўку маецца толькі ў некаторых гарадзішчаў, прычым толькі на гарадзішчы Пятрова ён з’яўляецца несумненна раннесярэднявечным, паколькі дарожка ад яго праз балота ідзе туды, дзе за 0,2 км ад гарадзішча знаходзіцца селішча, кераміка якога сведчыць пра храналогію гарадзішча.



Мал. 1. Планы і профілі малых гарадзішчаў-свяцілішчаў Смаленшчыны (1–7) і Паўночнай Букавіны (1 – Шапырова; 2 – Кушляншчына; 3 – Рудлава; 4 – Краснагорскае; 5 – Пятрова; 6 – Купрына; 7 – Булавіцы; 8 – Бабін; 9 – Ржавінцы; 10 – Куляшоўка)

Fig. 1. Plans and profiles of small hill-forts-sanctuaries of Smolensk region (1–7) and Northern Bukovyna

Па пытаннях мэтавага прызначэння гэтых гарадзішчаў і прыналежнасці іх пэўнаму этнасу А. Ляўданскі адзначаў, што тыя гарадзішчы з-за сваіх маленькіх памераў не маглі быць ні ўмацаванымі пунктамі на выпадак абароны ад нападу, ні месцамі сталага пражывання. Таму ён дапускаў, што яны служылі *“для абрадавых і ўвогуле рэлігійных мэтаў”*, пацвярджэннем чаго можа быць іх круглая форма. Зыходзячы з характару знаходак на размешчаных паблізу селішчах і курганах, А. Ляўданскі прыйшоў да высновы, што гарадзішчы гэтага тыпу несумненна належалі славянам, а змяшаны характар курганных пахаванняз тлумачыў уплывам крывіцка-радзіміцкага памежжа. Для менш вывучаных астатніх круглых гарадзішчаў, улічваючы знаходкі паблізу іх фрагментаў ляпной керамікі, ён дапускаў больш раннюю храналогію і прыналежнасць даславянскаму насельніцтву [Лявданский, 1924, с. 147–156].

Праз некаторы час, вяртаючыся да пытання класіфікацыі гарадзішчаў, А. Ляўданскі помнікі гэтага тыпу выдзеліў у асобную (трэцюю) групу, працягваючы лічыць іх абрадавымі [Лявданский, 1926, с. 187–190].

Пасля прац А. Ляўданскага вывучэнне выдзеленых ім круглых гарадзішчаў-селішчаў каля 30 гадоў не праводзілася, і толькі ў 1955–1958 гг. на левабярэжжы Дняпра паўднёвей і паўднёва-ўсходней Смаленска Смаленскім атрадам Сярэднерускай экспедыцыі Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры АН было праведзена суцэльнае археалагічнае абследаванне, у

выніку чаго былі абследваны вядомыя раней і адкрыты новыя круглыя гарадзішчы-свяцілішчы. Улічваючы адсутнасць на іх знаходак, для ўстанаўлення храналогіі гэтых помнікаў было выкарыстана адкрыццё па суседству з круглымі гарадзішчамі селішчаў і курганных могільнікаў перыяду Кіеўскай Русі, пачатковыя даты якіх адносяцца да IX–X стст. Гэта дало магчымасць В. В. Сядову датаваць круглыя гарадзішчы Смаленшчыны VIII–X стст. (магчыма, VIII–XI) і вызначыць іх характэрныя асаблівасці. Ён адзначыў, ні адно з даследаваных гарадзішчаў Смаленшчыны не магло мець ваенна-абарончага значэння. Пры іх узвядзенні не выкарыстаны рэльеф мясцовасці, пляцоўкі гэтых гарадзішчаў адкрытыя для праціўніка, паколькі валы нязначныя па вышыні і ў шэрагу выпадкаў знаходзяцца ніжэй пляцовак. Ірвы часта знаходзяцца паміж пляцоўкай і валам, што нязручна для абароны. Нарэшце, пляцоўкі гарадзішчаў занадта малыя для таго, каб быць сховішчамі. Гэтыя гарадзішчы выбудаваныя яўна з іншымі мэтамі і таму павінны быць выключаны з разраду абарончых збудаванняў [Седов, 1962, с. 58–63].

Адсутнасць культурных напластаванняў на гэтых помніках указвае на іх нежылы характар, таму для высвятлення прызначэння гарадзішчаў першаступеннае значэнне мае параўнаўчы матэрыял. Круглая пляцоўка, абмежаваная кругавым ірвом, а потым валам, або двума лініямі валоў, паміж якімі знаходзіцца роў, робіць падобнымі гэтыя гарадзішчы да знакамітага свяцілішча Аркона (на востраве Руген) і да Пярынскага свяцілішча паблізу Ноўгарада. Ірвы, якія абкружаюць пляцоўкі круглых смаленскіх гарадзішчаў, гэтак сама як і кругавыя равочкі раннесярэднявечных курганоў, мелі рытуальнае значэнне.

Паколькі абследаваныя А. Ляўданскім і В. Сядовым круглыя гарадзішчы-свяцілішчы Смаленшчыны знаходзяцца ў нізінах паблізу рэчак або на нізкіх мысах паблізу балота, то пры класіфікацыі гарадзішчаў паводле месца размяшчэння гэта давала падставу для залічэння іх у вялікую групу балотных гарадзішчаў, якія асабліва распаўсюджаны на поўдні Беларусі.

У далейшым даследаванні малых гарадзішчаў-свяцілішчаў праводзілі ў Сярэднім Паднястроўі і ў вярхоўях Прута І. Русанава і Б. Цімашчук. Іхнія пошукі ў межах Чарнавіцкай і часткова Івана-Франкоўскай абласцей Украіны паказалі, што свяцілішчы ў асноўным удалося адкрыць у тых гнёздах селішчаў, дзе не было гарадзішчаў-сховішчаў, што пацвердзіла думку гэтых даследчыкаў пра рэалізацыю сховішчамі і культавых функцый. У адрозненне ад Смаленшчыны, гарадзішчы-свяцілішчы Прыкарпацця знаходзяцца на высокіх узгорках, якія пануюць над акаляючай мясцовасцю. Канфігурацыя размяшчэння на іх ірвоў і валоў розная. Валы і равы бываюць канцэнтрычнымі, або дугападобна абкружаюць цэнтральную пляцоўку з напольнага боку, а часам размешчаны па схілу. Гарадзішчы-свяцілішчы Прыкарпацця характарызуюцца невялікай круглай пляцоўкай (дыяметр 7–20 м), якая абкружана неглыбокім ірвом, па вонкавы бок якога могуць размяшчацца яшчэ некалькі круглых і дугападобных валоў і равоў (мал. 1). Шырыня ўсёй сістэмы ірвоў і валоў можа ў некалькі разоў перавышаць дыяметр пляцоўкі. Прарэзкі валоў паказалі, што на іх вяршынях прысутнічалі сляды ад вогнішчаў, кальцынаваныя косці жывёл, абломкі посуду X–XI стст. са слядамі другаснай абпаленасці, абпаленыя камяні.

У адрозненне ад гарадзішчаў, якія былі месцамі сталага пражывання, валы свяцілішчаў мелі, як правіла, плоскую вяршыню або ступеньку на схіле, дзе гарэлі вогнішчы. Іх ірвы неглыбокія, з плоскім дном, на якім таксама шматразова раскладаліся вогнішчы, якія часта размяшчаліся на адмыслова складзеных каменных выбрукоўках. Там знаходзіліся, верагодна, *"палаючыя ахвярнікі"*, як іх называў Б. Рыбакоў. У вогнішчы кідалі мяса ахвярных жывёл і рытуальна разбітыя пасудзіны. Культавае значэнне мелі калодзежы, крыніцы вады і каменныя глыбы, якія знаходзіліся на свяцілішчах. Верагодна, валы і равы з вогнішчамі, якія там гарэлі, і грамадскія доўгія дамы ў прамежку паміж імі можна разглядаць як трэбішчы – *"месцы спажывання ахвяраў і рытуальнага піру"*.

Паводле высноў Б. Цімашчука і І. Русанавай, свяцілішчы Букавіны, гэтак сама як і аналагічныя помнікі Смаленшчыны, узніклі не раней VIII–IX стст. Амаль усе яны былі абкружаны сінхроннымі ім селішчамі і з'яўляліся культавымі цэнтрамі вялікіх гнёздаў

паселішчаў. Спынілі сваё існаванне яны ў XI – сярэдзіне XII ст., ужо пасля хрысціянізацыі [Тимощук, Русанова, 1983, с. 173].

Невялікія гарадзішчы-свяцілішчы меліся і на заходнеславянскіх землях. Напрыклад, такім крытэрыям адпавядаюць гарадзішчы ў Петэрсбергу і Ландсбергу (Усходняя Германія), размешчаныя на вяршынях высокіх гор, іх круглыя пляцоўкі абмежаваныя двума паясамі валоў. На гарадзішчы Ландсберг у падножжы вала і ў верхняй частцы яго насыпу, а таксама на плоскім дне ірва прасочваліся вугальныя праплласткі. З гэтымі гарадзішчамі звязаныя легенды пра існаванне на іх калісьці звычаю ахвярапрынашэнняў. На гарадзішчы Петэрсберг у XII ст. быў узведзены хрысціянскі храм, што ўскосна пацвярджае знаходжанне ў больш ранні час там свяцілішча (у раннесярэднявечнай Еўропе вельмі была распаўсюджана традыцыя будаваць на месцах язычніцкіх свяцілішчаў цэрквы ці касцёлы). На думку нямецкага археолага Й. Хермана, свяцілішчам з’яўлялася гарадзішча Таўфельсберг (Усходняя Германія), пляцоўка якога дыяметрам 30 м займала вяршыню конусападобнага ўзгорка, па схіле яна была абкружана эскарпам, падножжа ўзгорка абмежавана двума канцэнтрычнымі валамі і равамі. На краі пляцоўкі гарадзішча знойдзены вялікія камяні, вуголле, косці і зубы жывёл, абломкі сярэднявечнай керамікі [Русанова, Тимощук, 1993, с. 23].



Мал. 2. Выгляд гарадзішча-свяцілішча Верхаўляны
Fig. 2. View on the hill-fort-sanctuary of Verkhovlyany

Паводле меркавання І. Русанавай і Б. Цімашчука, магчыма, малыя гарадзішчы-свяцілішчы меліся і на тэрыторыі Польшчы. Яны дапускаюць, што функцыі свяцілішча магло выконваць гарадзішча Пустары (Заходнепаморскае ваяводства Польшчы) каля Калабжэга, якое займае вяршыню ўзгорка і мае круглую пляцоўку дыяметрам 7 м, на якой няма культурнага пласту, і якая абкружана кальцавым валам. Па абломках керамікі помнік датуецца XII–XIV стст. [Русанова, Тимощук, 1993, с. 23, 107].

У найбольш позніх сваіх публікацыях Б. Цімашчук выдзеліў наступныя археалагічныя прыкметы гарадзішчаў-свяцілішчаў: 1) размяшчэнне ў большасці выпадкаў на ўзвышшах, на месцы культавых гарадзішчаў больш ранняга часу. У некаторых выпадках яны займалі крутыя схілы ўзгоркаў; 2) наяўнасць капішча, дзе стаяў ідал, як абавязковай і найважнейшай іхняй складовай часткі. Будынкі, звязаныя з мірскім жыццём, на такіх гарадзішчах не ўзводзіліся; 3) культавыя валы, на вяршыні якіх знаходзіліся не абарончыя сцены, а ахвярныя пляцоўкі-алтары. Пад насыпам тых валоў выяўляюцца вогнішчы, пласты вуголля, попелу, абломкі глінянага посуду – рэшткі нейкіх рэлігійных абрадаў (напрыклад, ачышчэння ад злых духаў); 4) культавыя ірвы з плоскім дном, на якім таксама знаходзіліся ахвярныя пляцоўкі-алтары. Гэтыя ірвы маглі размяшчацца як з вонкавага, так і з унутранага боку культавага вала; 5) існаванне па-за межамі капішчаў грамадскай часткі свяцілішча, важным складовым кампанентам якой былі доўгія будынкі-канціны, дзе маглі праводзіцца ахвярныя і памінальныя банкеты, вяселлі, хаўтуры [Тимощук, 1999, с. 111].

Паводле высноў Б. Цімашчука, у VI–VII стст. з культавых помнікаў у славян існавалі толькі сакральныя пляцоўкі, ахвярныя ямы і пляцоўкі-алтары, што адпавядала невысокаму ўзроўню развіцця славянскага грамадства таго часу. Толькі найбольш развітыя абшчыны выкарыстоўвалі для выканання язычніцкіх абрадаў гарадзішчы- сховішчы з іхнімі доўгімі будынкамі-канцінамі. Новы, вышэйшы ўзровень развіцця ўсходнеславянскага грамадства прыпадае на VIII–IX стст., калі фарміруюцца абшчыны суседска-сямейнага тыпу. У той час сталі з'яўляцца культавыя помнікі новага тыпу – язычніцкія свяцілішчы з капішчамі, ад якіх захаваліся гарадзішчы з культавымі валамі і равамі [Тимощук, 1999, с. 117—118].

Паколькі малыя гарадзішчы-свяцілішчы не заўсёды ўдаецца дакладна датаваць (у прыватнасці, па прычыне адсутнасці на іхніх пляцоўках культурнага пласту), то складана прасачыць, у якой частцы тагачаснай славянскай айкумены найбольш рана з'явіўся гэты від сакральных помнікаў, і ў якім кірунку распаўсюджваўся. І. Русанава на падставе вывучэння значнага матэрыялу сцвярджала, што маленькія круглыя гарадзішчы-свяцілішчы былі ўласцівыя толькі сярэднявечным славянам і не сустракаліся ў суседніх народаў. У кельтаў круглыя свяцілішчы, абкружаныя ірвом або камянямі, былі распаўсюджаны яшчэ ў гальштацкі час [Русанова, 2002, с. 90–91]. Але самыя раннія круглыя свяцілішчы з'явіліся на захадзе Еўропы яшчэ да рассялення кельтаў, і класічным узорам такога свяцілішча з'яўляецца Стоўнхендж на поўдні Англіі (датуецца 2200–1400 гг. да н. э.), які ўяўляе сабой пляцоўку дыяметрам 105 м, абкружаную кальцавым ірвом, двума валамі і шэрагамі вялізных стаячых камянёў, якія служылі рэперамі для астранамічна-каляндарных назіранняў. Падобнае збудаванне, толькі горш захаванае, існуе ў Эйвберы [Русанова, 2002, с. 18–19].

На тэрыторыі Беларусі эталонным малым гарадзішчам-свяцілішчам можна лічыць гарадзішча каля в. Верхаўляны Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці (мал. 2). Помнік быў выяўлены Ф. Пакроўскім у канцы XIX ст. [Покровский, 1895, с. 45], у 1973 г. абследваўся Я. Зваругам, які склаў яго план [Зверуго, 1989, с. 193, рис. 98]. У 1986 і 1996 гг. даследаванні праводзіліся аўтарам.

Свяцілішча размешчана за 0,23 км на паўднёвы ўсход ад в. Верхаўляны і 0,07 км на поўдзень ад месца вытоку ручая, аднаго з прытокаў р. Верацейкі. якая ўпадае ў р.Свіслач (Нёманскую). Мясцовая назва помніка – "Гарадзішча". Дыяметр пляцоўкі каля 7 м, яна амаль з усіх бакоў абкружана ірвом, які ніжэй за пляцоўку на глыбіню ад 0,5 да 1,2 м, а ў паўночным ірве нават больш 2 м. Па вонкавы бок пляцоўкі і ірва знаходзіцца вал, які ўзвышаецца над пляцоўкай. Уваход на пляцоўку з паўночна-заходняга боку, там вал не выдзяляецца, а праз роў вядзе земляная перамычка. Падобная перамычка ёсць і з паўночна-ўсходняга боку, яна вядзе да пашкоджанай часткі вала. Магчыма, гэта перамычка больш позняга паходжання і насыпана за кошт паўночнай часткі ірва, які там найбольш шырокі і глыбокі (мал. 3). Знадворку з паўночнага боку вал пашкоджаны невялікім кар'ерам. Як расказваюць мясцовыя жыхары, тут нібыта знаходзілі чалавечыя чарапы і косці, а таксама знайшлі "старую шаблю".

Па будове (размяшчэнне ірва паміж пляцоўкай і валам) і круглай форме, а таксама надзвычай малых памерах пляцоўкі помнік прынцыпова не адрозніваецца ад малых гарадзішчаў-свяцілішчаў Смаленшчыны і Украінскага Прыкарпацця. Як роў, так і вал выконвалі на такіх свяцілішчах не абарончыя, а культавыя функцыі [Русанова, Тимощук, 1993, с. 20–24]. У дадзеным канкрэтным выпадку для верагоднага праціўніка, які ўзабраўся б на вал Верхаўлянскага гарадзішча, роў зусім не мог бы служыць перашкодай – абаронцаў ці жыхароў гарадзішча можна было б забіваць зверху, з размешчанага вышэй пляцоўкі вала. У 1986 г. быў закладзены шурф памерамі 2×2 м у цэнтры пляцоўкі, і 3 шурфы ў ірве: 1×1 м у паўднёвай частцы ірва, 2×1 м – ва ўсходняй частцы, і 1×1 м – паўночнай частцы ірва. Магутнасць культурнага пласту ў шурфе на пляцоўцы была ад 0,15 да 0,23 м, з яго ніжняй частцы прасочваліся вугольчыкі. Знойдзены былі нешматлікія абломкі ганчарнай керамікі, разбітыя крэмні, у тым ліку са слядамі апрацоўкі. У паўднёвым шурфе (роў) на глыбіні 0,4–0,6 м прасочвалася выбрукоўка з камянёў дыяметрам 0,18–0,25 м, пад якой залягаў мацярык. У гумусаваным пласце вышэй выбрукоўкі трапляліся фрагменты керамікі, расколатыя крэмні,

вуголле, косці і зубы жывёл, якія залягалі і паміж камянёў выбрукоўкі. Там жа, паміж камянёў, быў знойдзены і фрагмент ганчарнай керамікі з палівай знутры. Ва ўсходнім шурфе (роў) з глыбіні 0,35–0,4 да 0,6 м таксама ішла выбрукоўка з буйных камянёў. Вугольчыкі трапляліся і на мацерыку. У паўночным шурфе магутнасць гумусаванага пласту дасягала 0,75–м, з ніжняй частцы дзе-нідзе залягалі буйныя камяні, але суцэльнай выбрукоўкі не прасочвалася.




Мал. 3. План і профілі гарадзішча-свяцілішча Верхаўляны
Fig. 3. Plan and profiles of the hill-fort-sanctuary of Verkhovlyany

У 1996 г. на пляцоўцы закладзены раскоп плошчай 88 кв.м, які ахопліваў яе цалкам і праходзіў таксама па паўднёваму схілу. Паўднёвы край раскопа часткова ахопліваў дно ірва. За 4 м на захад ад паўночна-заходняга кута раскопа, паблізу ад уваходу на свяцілішча, была закладзена прарэзка вала даўжынёю 8 м і шырынёй 2 м. З паўночнага ўсходу да прарэзкі вала былі прырэзаны яшчэ 4 квадраты памерамі 2×2 м, і такім чынам утварыўся яшчэ адзін раскоп плошчай 32 м$^2$. Таўшчыня культурнага пласту (разам з дзёрнам) у раскопе на пляцоўцы вагалася ад 0,14 да 0,28 м, а ў сярэднім складала 0,2–0,22 м. На схіле пляцоўкі ён патанчаўся да 0,1 м, а ў ірве дасягаў 0,53 м. Таўшчыня дзёрну была каля 0,03–0,05 м. Культурны пласт складаўся з цёмна-шэрага да чорнага пяску ці супесі. У паўночна-заходняй частцы раскопа ў культурным пласце трапляліся камяні-валуны дыяметрам 0,1–0,2 м. Там, дзе паўднёва-заходнія квадраты раскопа заходзілі ў роў, у ніжняй частцы культурнага пласту залягала дробнае вуголле. Ніжэй культурнага пласту – мацярык, які складаецца са светлажоўтай супесі з дробнымі каменчыкамі. Каля ўсходняй сценкі раскопа была расчышчана частка ямы дыяметрам каля 2 м і агульнай глыбінёй амаль 1 м (на самай дзённай паверхні ў тым квадраце назіралася западзіна). Таўшчыня культурнага пласту ў яме – 0,6 м, ніжэй яго залягаў перадмацерыковы пласт чырвона-шэраватага пяску. У культурным пласце ямы прасочвалася досыць шмат камянёў, дыяметр якіх 0,16–0,30 м. Зыходзячы з меркавання Б. Цімашчука і І. Русанавай, што пляцоўкі малых гарадзішчаў-свяцілішчаў, абкружаныя ірвом, выконвалі функцыі капішчаў – месцаў, дзе стаяў драўляны ці каменны ідал [Тимощук, Русанова, 1983,

с. 170], можна дапусціць, што запоўненая камянямі яма каля ўсходняга краю пляцоўкі Верхаўлянскага свяцілішча таксама з'яўлялася месцам устаноўкі ідала.

На мацерыку раскопа, што займаў пляцоўку і яе схіл, налічваецца 29 ям і ямак розных памераў, дыяметрам у асноўным ад 0,06 да 0,4 м і глыбінёй 0,05–0,36 м, круглай або закругленай формы. Толькі адна з іх магла быць слупавой (дыяметр 0,2 м, глыбіня 0,36 м), знаходзілася яна ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопа. Паўднёвей яе, на схіле была расчышчана яма , якая мела выцягнутую (блізка да кірунку захад – усход) форму, памеры 1,74×0,84 м, максімальная глыбіня да 0,36 м. Дно ямы няроўнае і мела перапады глыбіні. Запаўненне зверху складалася з культурнага пласту (цёмна-шэрага пяску), ніжэй залягаў прапластак вуголля таўшчынёй 0,08–0,1 м, а ніжэй яго на дне ямы ізноў ішоў культурны пласт.

На пляцоўцы ў шэрагу месцаў ляжалі валунныя камяні дыяметрам ад 0,05–0,07 да 0,25–0,32 м. Таўшчыня культурнага пласту пад камянямі – каля 0,06–0,08 м. Найбольшае нагрувашчванне досыць шчыльна накладзеных камянёў знаходзілася ў заходняй частцы раскопа і мела даўжыню да 5,5 м і шырыню да 2 м. Другое шчыльнае нагрушчванне камянёў было блізка да паўночна-ўсходняга кута раскопа (побач з паўночна-ўсходняй перамычкай праз роў). Трэцяе шчыльнае нагрувашчванне знаходзілася на поўдзень ад другога, у вялікай яме каля ўсходняй сценкі (магчыма, там быў укапаны ідал). Разрэджанае нагрувашчванне камянёў цягнулася ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопа. У самай вялікай выбрукоўцы перапады вышынь паміж суседнімі камянямі дасягалі 0,1 м, у іншых – не перавышалі 0,06 м. Ва ўсіх выбрукоўках дзе-нідзе паміж камянямі сустракаліся прарэхі да 0,15–0,2 м шырынёй. Відавочна, у часы функцыянавання свяцілішча прарэхі былі запоўненыя культурным пластам, і выбрукоўка тады выглядала досыць роўнай. Камяні выбруковак – круглыя і авальныя неапрацаваныя валунчыкі крышталічнай пароды (тыпу граніту), і не маюць слядоў абпаленасці. У ірве, у адрозненне ад шурфоўкі 1986 г., выбрукоўку прасачыць не ўдалося, траплялiся толькі паасобныя невялікія камяні .

Максімальная вышыня вала адносна мацерыка дасягае 1,76–1,80 м. Пры прарэзцы валу выяўлены перадмацерыковы прапластак пахаванай глебы (цёмна-шэрага гумусаванага пяску) таўшчынёй 0,04–0,06 м. Каля ўнутранага падножжа вала гэты прапластак амаль зліваецца з культурным пластам.

У час раскопак знойдзены 124 абломкі ганчарнай керамікі, якая паходзіць як з культурнага пласту пляцоўкі, так і з прарэзкі вала, у тым ліку 19 фрагментаў венчыкаў. У прарэзцы вала кераміка траплялася на глыбіні ад 0,2 да 0,6 м ад дзённай паверхні. 8 фрагментаў венчыкаў і частка фрагментаў сценак датуюцца X–XI стст. Дыяметр пасудзін 13–22 см, таўшчыня сценак – найчасцей 0,75–1,0 см. Колер посуду – светлая вохра з шэрым, у цесце прыкметная дамешка пяску. Частка фрагментаў сценак мае дробнарыфлёную вонкавую паверхню. На адным з фрагментаў нанесены арнамент з насечак, іншыя арнаментаваныя пракрэсленымі лініямі. 7 абломкаў венчыкаў адносяцца да XII ст. Гліна менш вымешаная. Рыфленне на сценках пасудзін становіцца шырэйшым і менш глыбокім. 2 фрагменты венчыкаў ад адной пасудзіны датуюцца XIV–XV стст. Рыфленне сценак пасудзін захоўваецца. 2 абломкі венчыкаў мажліва датаваць XVI–пачаткам XVII стст. Да таго ж часу адносяцца абломкі цёмнага глянцаванага посуду (таўшчыня сценак – 0,4 см) і асколак бутэлечнага шкла. Кераміка больш позніх стагоддзяў (прынамсі, венчыкі) адсутнічае цалкам (датыроўка керамікі ветліва зроблена Н. Здановіч).

Характарызуючы стратыграфічнае размяшчэнне керамікі, варта адзначыць, што ў прарэзцы вала кераміка X–XI стст. залягае ў пластах II і III, г.зн. на глыбіні 0,2–0,4 і 0,4–0,6 м. Значыць, вал з унутранага боку падсыпаўся за кошт ранняга культурнага пласту. Наяўнасць пад валам перадмацерыковага прапластка пахаванай глебы сведчыць, што напачатку на ўзгорку вала не было. Першапачатковы вал, які меўся ў ранні перыяд існавання свяцілішча, складаўся з жоўта-шэрага суглінку і бела-жоўтай вапністай супесі. Недзе пасля XI ст. вал быў дадаткова падсыпаны за кошт жоўтай супесі з дробнымі каменьчыкамі і культурнага пласту.



Мал. 4. План гарадзішча-свяцілішча Малочкі
Fig. 4. Plan of the hill-fort-sanctuary of Malochki

На пляцоўцы свяцілішча на мацерыку ляжаў злёгку сагнуты чаранковы жалезны нож Агульная даўжыня нажа – 13,9 см, даўжыня чаранка – 4,7 см, найбольшая шырыня ляза – 1,4 см. У месцы злучэння чаранка з лязом з боку спінкі прасочваецца ўступ.

Пры раскопках выяўлена 319 крэмняў, пераважная частка іх без апрацоўкі. Але сярод крэмняў ёсць і прылады. Пры прарэзцы вала трапілася патынізаваная пласцінка даўжынёй 2,1 см. Другая пласцінка. даўжынёй 4,4 см знойдзена на мацерыку на пляцоўцы. На канцы пласцінкі маецца рэтушаваная выемка. З пляцоўкі паходзяць таксама канцавы скрабок на адшчэпе, невялікі нуклеус і праколка на адшчэпе. Ёсць і шэраг іншых крэмняў з другаснай апрацоўкай. Некалькі дзесяткаў крэмняў расколатыя. У цэлым, паводле заключэння В. Абухоўскага, крэмневыя прылады з Верхаўлянаў датуюцца фінальным палеалітам і мезалітам. Не вядома толькі: ці то свяцілішча было ўзведзена на месцы стаянкі каменнага веку, ці то заснавальнікі (або карыстальнікі) свяцілішча прынеслі спецыяльна ўсе гэтыя крэмені з іншага месца для выкарыстання ў культавых мэтах. Прыклады такога выкарыстання крэменяў або крамянёвых прылад добра вядомыя. Напрыклад , пры раскопках Ноўгарада ў пласце першай паловы XIV ст. н.э. у жытле ведзьмака-волхва знойдзены амулет у выглядзе крамянёвага наканечніка дзіды, апраўленага ў медны футарал пачатку XIV ст. Аналагічныя крамянёвыя прылады ў аправе, якія служылі амулетамі, выяўлены ў Белавозеры ў пласце X–XI стст. і ў былой Кіеўскай губерні. Сярод іншых знаходак маюцца 34 абломкі касцей жывёлаў,

выяўленыя пераважна пры прарэзцы вала (на глыбіні да 0,6 м) і ў ірве. Паводле аналізу астэалагічнага матэрыялу, ветліва зробленага П. Каліноўскім і часткова А. Разлуцкай, 20 касцей належалі буйной рагатай жывёле і 8 – дробнай рагатай жывёле, прычым сярод апошніх 2 косткі хутчэй за ўсё належалі барану.

Па сутнасці аднатыпным паводле будовы з круглымі гарадзішчамі-свяцілішчамі Смаленшчыны з'яўляецца гарадзішча каля в. Крынічка (б. Пупелічы) Барысаўскага раёна Мінскай вобл. Гарадзішча знаходзіцца за 1,5 км на паўночны ўсход ад в. Крынічка, у лесе, ва ўрочышчы Ключы, на правым (усходнім беразе р. Сха (Ісха)). Пляцоўка гарадзішча мае авальную форму і выцягнута з поўначы на поўдзень, яе памеры каля 50×44 м. Паверхня пляцоўкі паніжаецца ў заходні бок. З паўднёвага і заходняга краёў пляцоўкі знаходзіцца роў, з вонкавага боку абкружаны валам, а з паўночна-ўсходняга і паўночнага краёў пляцоўкі паслядоўна размешчаны вал (ці прыўзняты край пляцоўкі, роў і вонкавы вал . Шырыня ірва 4–7 м, глыбіня 1,3 м. Вонкавы вал знаходзіцца на адлегласці 7–12 м ад пляцоўкі, яго вышыня 2–3 м. Уваход на гарадзішча (земляная перамычка праз роў) знаходзіцца на ўсход ад пляцоўкі, шырыня перамычкі каля 3 м. Каля паўднёва-заходняга падножжа гарадзішча, на беразе р. Схі маюцца 3 крыніцы, якія тонкімі ручайкамі сцякаюць у рэчку. Крыніцы ўшаноўваюцца насельніцтвам і лічацца святымі.

Улічваючы размяшчэнне побач з гарадзішчам святой крыніцы (культ крыніц вядомы з першабытнага часу), а таксама падабенства гарадзішча на гарадзішчы-свяцілішчы Смаленшчыны і Паўночнай Букавіны (размяшчэнне ірва паміж пляцоўкай і валам), было вырашана правесці на гэтым помніку раскопкі. Былі закладзены два раскопы: адзін, памерамі 14×6 м, бліжэй да паўднёва-заходняга краю пляцоўкі, каля сцежкі, што вядзе да святой крыніцы; другі раскоп – за 10 м на ўсход ад паўднёва-ўсходняга кута раскопа № 1 і меў памеры 6х6 м, знаходзячыся за 10 м ад краю пляцоўкі. У раскопе № 1 магутнасць культурнага пласту вагалася ад 0,007 да 0,7 м, у раскопе № 2 – ад 0,16 да 0,32 м.

За 40 м на паўднёвы ўсход ад гарадзішча ў лесе, па абодва бакі дарогі, што вядзе на гарадзішча, пачынаецца курганная група, у якой Л. Побаль пры абследаванні ў 1990 г. налічыў 32 насыпы рознага дыяметру і вышыні. Паколькі такое размяшчэнне курганоў не выпадковае і павінна быць звязана з культавым выкарыстаннем гарадзішча і святой крыніцы ў раннім сярэднявеччы, то для ўстанаўлення храналогіі гэтай з'явы намі быў раскапаны адзін курган, які меў адносна невялікія памеры і знаходзіўся за 0,14–0,15 км ад уваходу на гарадзішча. Вышыня кургана была 0,7 м, дыяметр не перавышаў 7 м, равочак не прасочваўся. З улікам таго, што пахаванне рабілася на абапаленай падсыпцы, і ў ёй прасочваюцца лінзы попелу, пахаванне ў кургане можна датаваць другой паловай X–XI стст.

Абагульняючы вынікі раскопак на гарадзішчы каля в. Крынічка, можна канстатаваць, што першы этап засялення гарадзішча адносіцца да ранняга жалезнага веку, калі насельніцтва належала да культуры штрыхаванай керамікі. Ужо на тым этапе не выключана культавае ўшанаванне крыніцы каля падножжа гарадзішча. Другі этап функцыянавання помніка адносіцца да трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э., часу існавання банцараўскай культуры. Некаторыя вонкавыя прыкметы (размяшчэнне ірва паміж пляцоўкай і валам) характэрныя для гарадзішчаў-свяцілішчаў IX–X стст., якія функцыянавалі яшчэ досыць працяглы час пасля афіцыйнага прыняцця хрысціянства. Пра ўшанаванне гэтага гарадзішча-свяцілішча ў перыяд X–XI стст. сведчыць і размяшчэнне побач з гарадзішчам курганнай групы.

Помнікам, аднатыпным з Верхаўлянскім свяцілішчам, з'яўляецца размешчанае прыблізна за 100 км на паўднёвы захад ад яго свяцілішча Малочкі [Krasnodębski, 1997, s. 18–19; Krasnodębski, 1998, s. 30; Krasnodębski, 2000, s. 185–187; Olczak, Krasnodębski, 2002, s. 141–171; Wawrzeniuk, 2006, s. 173–174]. Гарадзішча-свяцілішча ляжыць за 1,5 км на поўнач ад в. Малочкі Бельскага павета Падляшскага ваяводства Польшчы, каля 17–18 км на поўдзень ад г. Бельск-Падляшскі.

Яно знаходзіцца на невялікім пясчаным узвышэнні, аточаным заліўнымі лугамі поплава р. Нурэц (Nurzec), якая працякае за 0,3–0,4 км паўночней. Першая згадка пра помнік

прыведзена ў 1960 г. вядомай даследчыцай К. Мусяновіч [Musianowicz, 1960, s. 224], якая зафіксавала і яго мясцовую назву – "Лысая гара". Раскопкі на ім праведзены ў 1997 г. супрацоўнікам Інстытута археалогіі і этналогіі Польскай Акадэміі навук Д. Краснадэмбскім. Раскоп памерамі 10×10 м быў закладзены ў цэнтральнай частцы помніка, у пэўнай меры ахопліваючы значную частку ірва і ўнутраную частку вала.

Гарадзішча трохі выцягнутае па лініі захад-усход, яго памеры 45×35 м. Звонку яго атачае вал вышынёй каля 2 м і шырынёй да 12 м. З заходняга боку вал трохі ніжэйшы і раздзяляецца, утвараючы дадатковы насып шырынёй каля 5 м. У цэнтральнай частцы гарадзішча ўзвышалася плоская пляцоўка дыяметрам каля 8 м. Паміж ёй і валам знаходзіцца роў, які атачае пляцоўку з поўначы, усходу і поўдня (мал. 4). Таўшчыня гумусаванага пласту на пляцоўцы складала 0,2–0,3 м, у ім патрапіліся нешматлікія фрагменты грубаляпной керамікі (яшчэ адзін фрагмент паходзіць з вала), якія датуюцца познім неалітам або пачаткам эпохі бронзы. Да таго ж часу адносяцца і 4 вырабы з крэменя (у тым ліку скрабок і нуклеус) [Olczak, Krasnodębski, 2002, s. 141–143].

Шырыня размешчанага паміж пляцоўкай і валам ірва даходзіла ў паўднёва-ўсходняй частцы раскопа да 2,5 м, а глыбіня (адносна пляцоўкі) была каля 0,5 м, дасягаючы ў паўднёвай частцы да 0,9 м. Дно ірва было плоскае, а сценкі мелі плаўны нахіл, у шэрагу месцаў на дне ірва выяўлены выбрукоўкі, складзеныя з булыжнікаў сярэдняга і вялікага памеру. Такія ўчасткі не ўтваралі суцэльнай густой выбрукоўкі, але размяшчаліся па коле асобнымі "гнёздамі". Падобная перарывістая выбрукоўка была заўважана і намі пры даследаванні ўнутранага ірва гарадзішча-свяцілішча Верхаўляны.

Вынікі праведзеных на гарадзішчы раскопак дазваляюць выдзеліць наступныя этапы існавання помніка. Напачатку быў выкапаны роў вакол цэнтральнай часткі прыроднага ўзгорка, дзякуючы чаму афармілася пляцоўка, а потым па вонкавым бак ірва быў насыпаны вал, першапачатковая вышыня якога даходзіла не менш чым да 3–3,5 м (цяпер вал узвышаецца над дном ірва на 1,5–2,3 м. Наступным этапам была ўкладка на дне ірва кругавой выбрукоўкі з камянёў, пакладзеных у 5(?) ярусаў. Шосты, найбольш прыкметны,быў на ўнутраным схіле ірва і цэнтральнай пляцоўцы. Праслойкі з рэшткамі гарэлага, якія залягаюць паміж камянёў і над імі, а таксама абпаленасць часткі булыжнікаў, сведчаць пра моцнае і доўгатэрміновае ўздзеянне агню. Але вуголле ад спаленых дошак з паўднёва-ўсходняй часткі раскопа, магчыма, з'яўляецца рэшткамі агароджы, якая першапачаткова стаяла на вяршыні вала. Аднак Г. Ольчак і Д. Краснадэмбскі не выключаюць таксама, што агароджа магла стаяць у ірве, па ўнутраны бок вала, каб прадухіліць яго асыпанне. Знішчэнне агароджы адбылося напрыканцы функцыянавання свяцілішча, ужо перад яго разбурэннем. Дапаўняючы гэтыя гіпотэзы, варта памятаць, што нагрушчванне вуголля магло з'явіцца ў выніку наўмыснага спальвання драўніны на вярхушцы вала. Пасля занядбання аб'екта адбылося накапленне ў ірве прыроднага чорнага пласту і паступовае асыпанне зямлі з вала [Olczak, Krasnodębski, 2002, s. 149].

Пры раскопках было знойдзена 19 дробных фрагментаў керамікі і адносна добра захаваны гаршчок з паўднёва-заходняй частцы раскопа. На думку Г. Ольчак і Д. Краснадэмбскага, асаблівасці як тэхналогіі апрацоўкі, так і арнаментацыі гаршка даюць магчымасць датаваць яго IX–X стст. хоць не выключаны і трохі больш позні час. Некалькі фрагментаў керамікі, якія паходзяць з пласту перапаленага пяску або з-пад выбрукоўкі, можна датаваць X–пачаткам XI ст. Адзін з абломкаў адносіцца да XI ст., а яшчэ два – да XII ст., хаця апошняя дата не можа лічыцца крытэрыем храналогіі асноўнай фазы функцыянавання помніка.

Вынікі раскопак і характар знойдзеных знаходак не даюць магчымасці аднесці гарадзішча Малочкі да аб'ектаў абарончага тыпу або паселішчаў, паколькі на ім адсутнічаюць як прадметы ўзбраення, так і рэчы штодзённага ўжытку, за выключэннем нешматлікіх фрагментаў керамікі, ня знойдзены на ім і прылады працы. Таксама адсутнічае як культурны пласт, так і рэшткі драўляных абарончых збудаванняў. Затое помнік у Малочках мае такія прыкметы малога гарадзішча-свяцілішча, як надзвычай невялікі дыяметр пляцоўкі (усяго 8 м), размяшчэнне ірва паміж валам і пляцоўкай (што выключае яго абарончае прызначэнне),

наяўнасць выбруковак з камянёў у шэрагу месцаў на дне ірва і сляды распальвання на іх ахвярных вогнішчаў. Значыць, “Лысая гара” каля Малочак адпавядае асноўным крытэрыям малых гарадзішчаў-свяцілішчаў, якія былі вылучаны В. Сядовым, І. Русанавай, Б. Цімашчуком [Русанова, 1992, с. 58—59; Седов, 1962, с. 57–64; Тимощук, 1989, с. 79]. Найбольш аналогій “Лысая гара” каля Малочак мае са свяцілішчам Верхаўляны ў Бераставіцкім раёне Гродзенскай вобл., належачы з ім фактычна да аднаго рэгіёну, хаця ёсць шмат рысаў падабенства і з малымі гарадзішчамі-свяцілішчамі Смаленшчыны і вярхоўяў Днястра і Прута.

Па выніках папярэдніх абследаванняў можна залічыць да групы малых круглых свяцілішчаў гарадзішча каля в. Пусты Асавец Магілёўскага раёна Магілёўскай вобл. Пляцоўка мае круглую форму, яе дыяметр каля 28 м, паверхня пляцоўкі ўвагнутай формы, краі трохі прыўзнятыя. З усіх бакоў пляцоўка аточана кругавым ірвом, дно якога ніжэй краёў пляцоўкі на 2–3 м. З вонкавага боку ірва размешчаны вал, вышыня якога над ірвом 1,2–1,5 м, а з вонкавага боку – 1,5–2 м. Гэта гарадзішча, якое мае мясцовую назву “Падгарадок”, упершыню было выяўлена пад канец XIX ст. [Фурсов, Чоловский, 1892, с. 38, карта]. У 1965 г. гарадзішча абследаваў Л. Побаль, які заклаў там невялікі шурф, у 1974 г. Я. Рыер, у 1978 г. Л. Дучыц, у 1990 г. В. Капыцін [Копытин, 1993, с. 38, рис. 25], у 1997 г. Э. Зайкоўскі. У шурфе памерамі 1×1 м, які быў закладзены ў паўночна-ўсходняй частцы пляцоўкі , магутнасць культурнага пласту да 0,3 м, ён шэрай афарбоўкі. Кераміка або рэчы не знойдзены, выяўлены толькі абпаленыя камяні, попел і вуголле [Поболь, 1974, с. 219–221].

Яшчэ чатыры дзесяцігоддзі таму, ствараючы тыпалогію гарадзішчаў Латвіі, А. Стубаўс выдзеліў сярод іх групу гарадзішча-свяцілішчаў. У гэту групу ён залічыў найперш гарадзішча Айзвікі, размешчанае трохі ўсходней г. Ліепая, на тэрыторыі, якая ў раннім сярэднявеччы ўваходзіла ў племянны арэал куршаў. Гарадзішча размешчана на невысокім пагорку і мае круглую пляцоўку дыяметрам 32 м, абкружаную кальцавым ірвом. Па вонкавы бок ірва знаходзіцца вал, вышыня якога ўсяго 0,5–1 м [Stubavs, 1974, 75. lpp.; Urtāns, 1993, 17–18 lpp.]. Улічваючы невялікую вышыню вала, а таксама размяшчэнне ірва паміж валам і пляцоўкай, якое пазбаўлена сэнсу з пункту гледжання фартыфікацыі, можна правесці аналогію з круглымі гарадзішчамі-свяцілішчамі Смаленшчыны і Паўночнай Букавіны, якія маюць падобную будову. Але круглыя гарадзішчы-свяцілішчы такога тыпу належалі славянам, а гарадзішча Айзвікі знаходзіцца ў адрыве ад славянскага арэалу, на тэрыторыі куршаў. Значна бліжэй да славянаў, у ваколіцах г. Даўгаўпілса, знаходзіцца Падгурскае гарадзішча, якое размешчана на асобна стаячым узгорку круглаватай формы і мае амаль круглую пляцоўку, ніжэй якой па схілах узгорка праходзіць вал [Stubavs, 1974, 76. lpp., 2 att.]. Як і на іншых гарадзішчах-свяцілішчах, вал аддзелены ад пляцоўкі ірвом.

У тым выпадку, калі згаданае раней гарадзішча Айзвікі ўсё-такі пакінута славянамі ці з’явілася пад іхнім уздзеяннем, гэтаму можна знайсці тлумачэнні. У свой час В. Сядоў звярнуў увагу на тое, што адным з этнасаў сярэднявечнай Латвіі, побач з латгаламі, лівамі, куршамі і селамі, былі венды, пра якіх згадвае “Хроніка Лівоніі” Генрыха Латвійскага (XIII ст). Паводле “Хронікі Лівоніі”, венды першапачаткова жылі ў Курземе (Курляндыі), у басейне р. Вінды (сучасная р. Вента), адкуль былі прагнаныя куршамі [ Генрих Латвийский, 1938, X, 14].Этнонім вендаў сугучны з назвай венедаў, а добра вядома, што германцы і прыбалтыйскія фіны яшчэ са старажытнасці венедамі або вендамі традыцыйна называюць сваіх славянскіх суседзяў [Седов, 1995, с. 174–182].

Такім чынам, даследаванне малых гарадзішчаў-свяцілішчаў паказвае,што яны былі распаўсюджаны на Смаленшчыне, на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у Прыкарпацці, дзе-нідзе ў Польшчы і на былых землях палабскіх славян. Яны маюць круглую ці авальную форму, пляцоўку дыяметрам 7–30 м, максімум да 50 м, паміж пляцоўкай з валам знаходзіцца роў, або дзве лініі валоў з ірвом паміж імі. Ірвы даволі неглыбокія, з плоскім дном, на якім шматразова раскладаліся вогнішчы, што нярэдка размяшчаліся на каменнай выбрукоўцы. Роў і вал на гарадзішчах-свяцілішчах выконвалі не абарончую функцыю, а аддзялялі сакральную прастору свяцілішча ад навакольнай прафаннай прасторы. Найбольш эталонным помнікам такога тыпу

на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'яўляецца малое гарадзішча-свяцілішча каля в. Верхаўляны. Яно пачало функцыянаваць яшчэ ў X ст., і як паказала прарэзка вала, недзе пасля XI ст. ён быў дадаткова падсыпаны, што сведчыць пра далейшае выкарыстанне свяцілішча. На ім трапляецца кераміка ад X да XVI–XVII стст. Верхаўлянскае гарадзішча-свяцілішча з'яўлялася часткай сакральнага комплексу, да якога яшчэ належалі размешчаныя побач вытокі рэчкі і вялізны валун каля яго.

У свой час А. Ляўдански, грунтуючыся на тапаграфіі вядомых яму малых гарадзішчаў-свяцілішчаў Смаленшчыны, залічыў іх у вялікую групу балотных гарадзішчаў. Аднак вывучэнне такіх свяцілішчаў на іншых тэрыторыях паказала, што размяшчэнне іх у паніжаных і балоцістых мясцінах зусім не абавязковае, і што ні храналагічна, ні паводле будовы, ні функцыянальна яны не маюць нічога агульнага са шматлікімі балотнымі гарадзішчамі жалезнага веку, характэрнымі для поўдня Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

*Генрих Латвийский* (1938). Хроника Ливонии / Введение, перевод [с латин.] и комментарии С.А. Аннинского. Предисл. В.А. Быстрянского. – Изд. 2 [сокращенное] – Москва–Ленинград. – XV. – 352 с.

*Зайкоўскі Э.* (1998). Язычніцтва на сумежжы Панямоння і Падляшша ў сярэднявеччы // Białoruskie Zeszyty Historyczne, 9. Беларускі гістарычны зборнік, 9 / Redaktor: E. Mironowicz. – Białystok. – С. 120–123.

*Зайкоўскі Э.* (2002). Даследаванне свяцілішча каля в.Верхаўляны // Матэрыялы па археалогіі Беларусі / Рэд. А.М. Мядзведзеў. – № 5. – Мінск. – С. 33–40.

*Зверуго Я.Г.* (1989). Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. – Минск: Навука і тэхніка. – 207[1] с.

*Копытин В.Ф.* (1993). Археологические памятники Могилева и окрестностей. – Могилев. – 50 с.

*Лявданский А.Н.* (1924). Материалы для археологической карты Смоленской губернии // Труды смоленских государственных музеев. – Смоленск. – Вып. 1. – С. 127–184.

*Лявданский А.Н.* (1926). Некоторые данные о городищах Смоленской губернии // Отдельный оттиск из Научных Известий Смоленского Государственного Университета. – Том III. – Вып. 3. – Смоленск. – С. 180–296.

*Поболь Л.Д.* (1974). Славянские древности Белоруссии (свод археологических памятников раннего этапа зарубинецкой культуры – с середины III в. до н.э. по начало II в. н.э.) / Ред. Ю.В. Кухаренко. – Минск: Наука и техника. – 424 с.

*Покровский Ф.В.* (1895). Археологическая карта Гродненской губернии. – Вильна. – 165 с.

*Русанова И.П.* (1992). Культовые места и языческие святилища славян VI–XIII вв. // Российская археология. – №4. – С. 50–67.

*Русанова И.П.* (2002). Истоки славянского язычества. Культовые сооружения Центральной и Восточной Европы в I тыс. до н.э. – I тыс. н.э. – Черновцы. – 172 с.

*Русанова И.П., Тимощук Б.А.* (1993). Языческие святилища древних славян / Под редакцией доктора ист. Наук С.А. Плетневой. – Москва. – 144 с.

*Седов В.В.* (1962). Языческие святилища смоленских кривичей // Краткие сообщения Института археологии Академии наук СССР. – Вып. 37. – С. 57–64.

*Седов В.В.* (1995). Славяне в раннем средневековье / Ред. Н.В. Лопатин. – Москва. – 416 с.

*Тимощук Б.А.* (1989). Об археологических признаках восточнославянских городищ-святилищ // Древние славяне и Киевская Русь. Сборник научных трудов / Отв. ред. П.П. Толочко. – Киев: Наук. думка. – С. 74–83.

*Тимощук Б.А., Русанова И.П.* (1983). Славянские святилища на Среднем Днестре и в бассейне Прута // Советская археология. – № 4. – С. 161–173.

*Фурсов М.В., Чоловский С.Ю.* (1892). Дневник курганных раскопок, произведенных по поручению г. Начальника Могилевской губернии А.С. Дембовецкого, в течение 1892 г. в уездах Рогачевском, Быховском, Климовичскоим, Чериковском и Мстиславском д. ст. сов. Фурсовым и

старшим чиновником особых поручений при губернаторе С.Ю. Чоловским // Памятная книжка Могилевской губернии на 1893 г., приложение. – Могилев. – С. XXV–LXXXIII.

*Krasnodębski D.* (1998). Na ratunek tajemniczym grodziskom Podlasia // Archeologia żywa. Kwartalnik. – № 2(7). – S. 28–31.

*Krasnodębski D.* (2000). Podlasie na przelomie I i II millennium w swietle wyników najnowszych badań archeologicznych // Osadnictwo i architertura ziem polskich w dobie zjazdu gnieznienskiego / Pod red. A. Buko i Z. Swiechowskiego. – Warszawa. – S. 179–190.

*Krasnodębski D.* (1997). Starozytności z Mołoczków. Badania ratownicze przeprowadzone na terenie stanowiska archeologicznego Mołoczki, st. 1 ("grodzisko") i st. 2 (osada), gmina Boćki // Над Бугом і Нарвою. Ukrainskie pismo Podlasia. – Bielsk Podlaski, 6(34). – S. 18–19.

*Musianowicz K.* (1960). Granica mazowiecko-drehowicka na Podlasiu we wczesnym średniowieczu // Materialy Wczesnośredniowieczne. – T. 5. –Warszawa. – S. 187–230.

*Olczak H., Krasnodębski D.* (2002). Wczesnośredniowieczne miejsce kultu i osada w Mołoczkach, pow. Bielsk Podlaski, woj. Podlaskie // Sprawozdania archeologiczne. – T. 54. – S. 141–171.

*Stubavs A.* (1974). Par Latvijas pilskalnu tipologiju un klasifikāciju // Arheologija un etnogrāfija. XI Apcerējumi par Latvijas materiālās un garīgās kultūras pieminekļu tipologiju un hronologiju un hronologiju / Red. kolēgija: Ē. Mugurēvičs (atb. red.) un otr. – Rīga: Zinātne. – 88 pp.

*Urtāns J.* (1993). Latvijas senas svētnicas. – Rīga: Latviajas enciklopēdija. – 110 pp.

*Wawrzeniuk J.* (2006). Słowiańskie miejsca kultu na Podlasiu we wczesnym średniowieczu w swietle badań etnoarcheologicznych // Stan badań archeologicznych na pograniczu polsko-białoruskim od wczesnego średniowiecza po czasy nowożytne. Pod redakcją H. Karwowskiej i A. Andrzejewskiego. – Białystok. – S. 173–196.

REFERENCES

Genrih Latvijskij (1938). *Hronika Livonii* / Vvedenie, perevod [s latin.] i kommentarii S.A. Anninskogo. Predisl. V.A. Bystrjanskogo. Moskva–Leningrad, 15 (2), 352 pp. (in Russian).

Zaykoўski, E. (1998). Yazychnitstva na sumezhzhy Panyamonnya i Padlyashsha ў syarednyavechchy. *Białoruskie Zeszyty Historyczne, 9. Belaruski gistarychny zbornik, 9.* E. Mironowicz (Ed.). Białystok, 120–123 (in Belarusian).

Zaykoўski, E. (2002). Dasledavanne svyatsilishcha kalya v.Verhaўlyany. *Materyyaly pa arhealogii Belarusi, 5.* A.M. Myadzvedzeў (Ed.). Minsk, 33–40 (in Belarusian).

Zverugo, Ja.G. (1989). *Verhnee Poneman'e v IX–XIII vv. Minsk: Navuka i tjehnika*, 207[1] pp.(in Russian).

Kopytin, V.F. (1993). *Arheologicheskie pamjatniki Mogileva i okrestnostej.* Mogilev, 50 pp. (in Russian).

Ljavdanskij, A.N. (1924). Materialy dlja arheologicheskoj karty Smolenskoj gubernii. *Trudy smolenskih gosudarstvennyh muzeev, 1.* Smolensk, 127–184 (in Russian).

Ljavdanskij, A.N. (1926). Nekotorye dannye o gorodishhah Smolenskoj gubernii. *Otdel'nyj ottisk iz Nauchnyh Izvestij Smolenskogo Gosudarstvennogo Universiteta*, 3(3). Smolensk, 180–296 (in Russian).

Pobol', L.D. (1974). *Slavjanskie drevnosti Belorussii (svod arheologicheskih pamjatnikov rannego jetapa zarubineckoj kul'tury – s serediny III v. do n.je. po nachalo II v. n.je.).* Ju.V.Kuharenko (Ed.). Minsk: Nauka i tehnika, 424 pp. (in Russian).

Pokrovskij, F.V. (1895). *Arheologicheskaja karta Grodnenskoj gubernii.* Vil'na. 165 pp. (in Russian).

Rusanova, I.P. (1992). Kul'tovye mesta i jazycheskie svjatilishha slavjan VI–XIII vv. *Rossijskaja arheologija, 4*, 50–67 (in Russian).

Rusanova, I.P. (2002). *Istoki slavjanskogo jazychestva. Kul'tovye sooruzhenija Central'noj i Vostochnoj Evropy v I tys. do n.je.–I tys. n.je.* Chernovcy, 172 pp. (in Russian).

Rusanova, I.P., & Timoshhuk, B.A. (1993). *Jazycheskie svjatilishha drevnih slavjan.* S.A. Pletnevoj (Ed.). Moskva, 144 pp. (in Russian).

Sedov, V.V. (1962). Jazycheskie svjatilishha smolenskih krivichej. *Kratkie soobshhenija Instituta arheologii Akademii nauk USSR, 37*, 57–64 (in Russian).

Sedov, V.V. (1995). *Slavjane v rannem srednevekov'e.* N.V. Lopatin (Ed.). Moskva, 416 pp. (in Russian).

Timoshhuk, B.A. (1989). Ob arheologicheskih priznakah vostochnoslavjanskih gorodishh-svjatilishh. *Drevnie slavjane i Kievskaja Rus'. Sbornik nauchnyh trudov.* P.P.Tolochko (Ed.). Kiev: Naukova dumka, 74–83 (in Russian).

Timoshhuk, B.A., & Rusanova, I.P. (1983). Slavjanskie svjatilishha na Srednem Dnestre i v bassejne Pruta. *Sovetskaja arheologija, 4,* 161–173 (in Russian).

Fursov, M.V., & Cholovskij, S.Ju. (1892). Dnevnik kurgannyh raskopok, proizvedennyh po porucheniju g. Nachal'nika Mogilevskoj gubernii A.S. Demboveckogo, v techenie 1892 g. v uezdah Rogachevskom, Byhovskom, Klimovichskoim, Cherikovskom i Mstislavskom d. st. sov. Fursovym i starshim chinovnikom osobyh poruchenij pri gubernatore S.Ju. Cholovskim. *Pamjatnaja knizhka Mogilevskoj gubernii na 1893 g., prilozhenie.* Mogilev, 25–83 (in Russian).

Krasnodębski, D. (1998). Na ratunek tajemniczym grodziskom Podlasia. *Archeologia żywa. Kwartalnik, 2(7),* 28–31 (in Polish).

Krasnodębski, D. (2000). Podlasie na przelomie I i II millennium w swietle wyników najnowszych badań archeologicznych. *Osadnictwo i architertura ziem polskich w dobie zjazdu gnieznienskiego.* A. Buko & Z. Swiechowskiego (Ed.). Warszawa, 179–190 (in Polish).

Krasnodębski, D. (1997). Starozytności z Mołoczków. Badania ratownicze przeprowadzone na terenie stanowiska archeologicznego Mołoczki, st. 1 ("grodzisko") i st. 2 (osada), gmina Boćki. *Nad Buhom i Narvoiu. Ukrainskie pismo Podlasia, 6(34).* Bielsk Podlaski, 18–19 (in Polish).

Musianowicz, K. (1960). Granica mazowiecko-drehowicka na Podlasiu we wczesnym średniowieczu. *Materialy Wczesnośredniowieczne, 5.* Warszawa, 187–230 (in Polish).

Olczak, H., & Krasnodębski, D. (2002). Wczesnośredniowieczne miejsce kultu i osada w Mołoczkach, pow. Bielsk Podlaski, woj. Podlaskie. *Sprawozdania archeologiczne, 54,* 141–171 (in Polish).

Stubavs, A. (1974). Par Latvijas pilskalnu tipologiju un klasifikāciju. *Arheologija un etnogrāfija. XI Apcerējumi par Latvijas materiālās un garīgās kultūras pieminekļu tipologiju un hronologiju un hronologiju.* Ē. Mugurēvičs (Ed.). Rīga: Zinātne, 88 pp. (in Latvian).

Urtāns, J. (1993). *Latvijas senas svētnicas.* Rīga: Latviajas enciklopēdija, 110 pp.

*Wawrzeniuk, J.* (2006). Słowiańskie miejsca kultu na Podlasiu we wczesnym średniowieczu w swietle badań etnoarcheologicznych. *Stan badań archeologicznych na pograniczu polsko-białoruskim od wczesnego średniowiecza po czasy nowożytne.* H. Karwowskiej & A. Andrzejewskiego (Eds.). Białystok, 173–196 (in Polish).

*Стаття: надійшла до редакції 22.11.2016*
*прийнята до друку 29.11.2016*

## SMALL HILL-FORTS-SANCTUARIES OF SLAVS

*Edvard ZAIKOUSKI*

*The Centre for Belarusian Culture, Language and Literature Research of NAS of Belarus, Surganav Str., 1/2, 220072, Minsk, Belarus, e-mail: edvard_mensk@tut.by*

Group of small round hill-forts was distinguished in the first time among the sites of Smolensk region in 1920 by A. Lyaudanski, who suggested that they were used for ceremonial purposes. In the postwar period V. Sedov dated them back to VIII–X centuries and substantiated the religious function of them. But because some of these hill-forts-sanctuaries of Smolensk region are situated in low places, both these researchers considered that such location is the feature of the sites of this type.

However, later small hill-forts-sanctuaries, located on the high hills, were discovered and examined in the Middle Dniester region and headwaters of Prut River in Western Ukraine. Almost all of them were surrounded by synchronous settlements and were the cult centers of large groups of settlements. They stopped to exist after the Christianization.

In Belarus, a basic site of this type is a hill-fort-sanctuary Verkhovlyany that appeared in X century. Sanctuary of the same type Malochki is situated in Eastern Poland. In addition, small round hill-forts-sanctuaries, similar by the basic features can be recognized among a number of other sites on the territory of Belarus, Polish Pomerania, the former lands of Polabian Slavs and even in Latvia (where they may be associated with the process of penetration of some groups of ethnic Slavs into the different ethnic environment).

***Key words:*** hill-forts, sanctuaries, settlements, Verkhovlyany, Slavs.